Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць проэвішчэ разам с фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. | 6 Лістапада 1914 г. | № 44

*Усім, хто перад Новым Годам захочэ абзнаеміцца з „Н. Н.“, калі прышле свой адрэс, то кантора Рэдакціі будзе высылаць газэту дз Новаго Году ДАРМА.*

## У гадаушчыну.

*(10/XI 1906—10/XI 1914).*

Невясёлая гэта новая гадаўшчына нарадзін «Нашае Нівы» У цяжкі, сумны час надыйшла яна.

Ліюцца рэкі крыві. Сотні, тысячы ваякоў косіць вайна кожны дзень сваей востраю касою. А па ўсей нашай старонцы, што гэтак многа ахвяр аддала вайне і людзьмі і багацьцем сваім, пануе сум—смутак.

І ў дзень, калі, здаецца, трэба цешыцца, што-ткі, ня гледзячы на ўсё, «жыве Беларусь», — у гэты дзень німа мейсца для ўцехі. Трэба сур'ёзна глянуць на тое, што творыцца навакол нас, трэба, апіраючыся на наш прыбытак за мінулые гады, разважаць аб будучыне.

«Наша Ніва» нарадзілася ў той момэнт, калі беларуская нацыянальная сьведомасьць першы раз збудзілася ў шырокіх кругах народных, калі з'усюль чутны былі галасы, што нам без газэты ніяк нельга быць. Нарадзілася яна, як *едыная* беларуская газэта, як першы расток на ніве народнай. А як за першым усходам зерняці на полі вырастае густая зялёная рунь, што суліць багаты ураджай,—так праз восем гадоў з'яўляліся ўсё новые і новые газэціны і кніжкі беларускіе, атквываліся хаўрусы і суполкі выдавецкіе, закладаліся таварыствы, кружкі, коопэратывы і іншые беларускіе грамадзянскіе організаціі. За «Нашай Нівай» пайшла «Маладая Беларусь», «Саха», «Беларус», «Лучынка», «Раніца». Поруч с першай петраградзкай суполкай «Загляне сонцэ і і ў нашэ ваконцэ» пачалі выдаваць беларускіе кніжкі «Наша Хата», «Мінчук», «Полочанін», «Беларускае Выдавецкае Таварыство», «Беларус» і ўсе яны паводлуг сіл і можнасьці працавалі і працуюць дзеля справы адраджэньня беларускаго народу. У Вільні, Мінску і Полацку паатквываліся беларускіе кнігарні. Поруч з віленскім «Беларускім музыкальна-драматычным гуртком» організуюцца гэткіе-ж гурткі ў Мінску, Петраградзі і інш. А ў апошні час перад вайной грамадка беларускіх працаўнікоў ладзілася атквыць у Вільні беларускае навуковае таварыство і музэй.

Гэтак ідзе скрозь спорная культурная работа беларусоў. Гусьцее і расьце рунь на нашым полі, і хоць вайна з яе страшэнствамі прымарозіла маладые усходы, хоць багата рабочых рук адарвала ад роднай нівы і паставіла ў рады войск, хоць агульны застой стрымлівае узрост беларускаго нацыянальнаго руху,—мы верым у сілу і моц культуры, каторая адбудуе ўсе страты нашы ад вайны, верым, што мінецца сьцюжа з марозамі, што ізноў заясьнее над намі яснае сонейка, — *абы толькі мы самі перетрывалі час ліхалецьця, абы асталіся цьвёрдымі і моцнымі ды не загубілі сваіх найдаражэйшых ідэалоў і нашай веры у іх.*

Зарастуць густой травой сьвежые магілы. Вернецца знішчэнае дабро. І гдзе цяпер пануе сум і смутак, там ізноў пачуем сьмех радасьці, сьмех шчасьця.

# ВАЙНА.

Гасудар Імпэратар і Гасударыня Імпэратрыца з Найдастайнейшымі Дочкамі вярнуліся 2 лістапада у Царскае Сяло.

---

### Расейска-Аўстрыяцкая.

Перайшоўшае у Галіччыне р. Віслону расейскае войска дасьцігла палавіны дарогі паміж Перамышлям і Краковам, паачародку заняўшы далей лінію Санок, Кросно, Ясло і Тарнов. Спыненая асада Перамышля, у часе наступаньня аўстрыякоў, ізноў пачалася. Аўстрыяцкае войска, пераможэнае у раёне Санок—Турка, атступае ў Карпацкіе пераходы. На захад ад Жабно—Тарнов і на Віслоцэ ў раёне Ясло аўстрыякі мецюцца наладзіць абарону на р. Дунайцу. У бітве на поўдня ад Ліско расейцы узялі у палон 10 Аўстрыяцкіх афіцэроў і каля 1000 салдатоў. 4 лістапада. Аўстрыяцкіе атрады атакованы расейскімі у раёне Дукля і на Карпацкім перэвалі Ужок. Наступаньне расейскаго войска на шляхах к Кракову не спыняецца, ужо перайшло рэчку Шрэняву.

### Расейска Нямецкая.

У Ўсходняй Прусіі цэлы ты дзень ішлі заўзятые і крывавые бітвы за пераходы паміж мазурскіх азёроў і на фронце Сталюпэнен—Круглянкен, а такжэ у раёне Сольдау, прычым расейцы узялі Іоганненсбург, а каля Сольдау узялі 5 нямецкіх гаубіц. Ва ўсіх гэтых мейсцах расейскае войска з боем прабіваецца і пасовываецца наперад. 4 лістапада на фронце Гумбінен—Ангербург немцы атступаюць, трымаючыся ешчэ у праходах церез мазурскіе азёры.

С першых дзён лістапада, дзякуючы атрыманай падмозе, немцы пачалі наступаць у ваколіцы паміж Віслай і Вартай. З гэтай прычыны паміж расейскім і нямецкім войскам пачаліся заўзятые бітвы, якіе цапер разшыраюцца на фронце Плоцк—Лэнчыца—Унсёв. 4 лістапада на гетым фронце між Віслай і Вартай бітвы не спыняюцца, прыймаючы характар вялікай барацьбы з немалымі сіламі немцоў.

### Расейска-Турэцкая.

Пасьля неспыняўшыхся заўзятых і крывавых бітваў ад 24 кастрычніка да 1 лістапада на Каўказе у раёне Кепрыкея, расейскіе пярэдніе атрады як сьлец выясьнілі згрупаваньне глаўных сіл праціўніка. С прычыны-ж немалой падмогі, падыйшоўшай туркам за апошніе дні са стараны Хныскала—Эрзерума—Трупезунда, расейскіе атрады з боем атходзюць у назначэные для іх раёны. 26 лістапада пачаліся ваенные змаганьня паміж расейскім і турэцкім войскам у пагранічных с Пэрсіей раёнах на Ханесурскім перэвале. У бітве прыймаюць учасьце і курды, с каторых часьць ваюе проці расейцоў, а часьць проці туркоў. 3 лістапада ішла перастрэлка с турэцкім войскам на граніцы з Батумскай областцю. Высілкі туркоў прабрацца наперад на Эрзерумскім напрамку не ўдаліся. Атрад курдоў пачаў зноў перастрэлку з расейцамі каля Азэрбэйджэна, але так сама не ўдачна.

### Француска-Англіцка-Бэльгійска-Нямецкая.

На ўсім гэтым полі бітвы крывавые змаганьня не спыняюцца, не прыносючы вялікіх пабедоў ні аднэй ні другой старане, бо, то хаўрусьнікі пасунуцца наперад на якую вярсту, захопліваючы які ласкут зямлі ці лясок, то—немцы. Усе заўзятые атакі нямецкаго войска хаўрусьнікі храбра адбіваюць.

### Сэрбска-Аўстрыяцкая.

Апошняя вестка ад 2 лістападу з гэтаго поля бітвы такая: маючы на увазе перэвагу аўстрыяцкаго войска большаго лікам, якое прабралося на сэрбскую зямлю, сэрбскае войска пачародку атходзіла, каб мець магчымасьць прыняць бітву пры найболей удатных варунках. І дзеля гэтаго сэрбскае войска пакінуло Пецку, Завлагу і Коцелево.

### Вайна на моры.

Расейскі генеральны штаб морскі паведамляе, што 4 лістапада, раніцай, к Лібаве падыйшоў атрад нямецкай эскадры з двух крэйсероў, некольні параходаў і дзесяці мінаносцаў. Немцы ізноў абстрэлялі горад і порт (прыстань), прычыніўшы некольні пажароў. Раніцай 4 лістапада Чорнаморскі флот, плаваўшый на моры, падыйшоў к турэцкаму форту (укрэпленьню) Трапезунду, абстрэляўшы форт і казармы, выклікаў на беразе вялікі пажар. На моры турэцкіх караблёў не сустрэчэна.

---

**К вайне с Турэччынай**. Газэта «Кавказ» пішэ: „Вайна вядзецца пры над'звычайна трудных варунках, якіе падчас непарэмагчымы. Заместа дарог—занесеные сьнегам пуцявінкі. Мастоў або німа, або яны зусім непрыгодны для артылеры і ваенных грузоў. Мейсцовых харчоўных прадуктоў не хапае. Якіе былі запасы харчоў туркі вывезьлі. Туркі—вораг сур'ёзны, аб чым сьведчуць страшэнна заўзятые колькіразовые атакі на Кепрыкей. Пабеда над туркамі тлумачыцца храбрасьцю пасівеўшых у бітвах с туркамі каўкаскіх войск, аб вытрымаласьць якіх разьбілося упорство фанатычнаго ворага“.

**Пратэст нэўтральных (не ваючых) дзержавоў**. У англіцкае міністэрства заграничных справоў паступіў пратэст Паўночна-Амэрыканскіх Злучэных Штатоў с прычыны апошніх паступкоў англіцкаго ураду, скераваных проці нэйтральнаго морэплаўства. У пратэсьце гаворыцца, што Англія пераходзіць граніцы сваіх правоў, конфіскуючы тавары, якіе толькі пры вядомых варунках магуць лічыцца ваеннай контрабандай. Каб затрымліваць увоз тавароў у непрыяцельскіе краі, як кажуць Злучэные Штаты, Англія павінна была зрабіць на гэта стасоўную, згоду з нэўтральнымі дзержавамі, чаго ўсё-ж такі дагэтуль не зрабіла.

Адначасна пратэстуюць проці паступкоў ваюючых дзержавоў Швэція, Норвэгія і Данія, ссылаючыся на нарушэньне правоў нэўтральных гасударствоў па часьці морэплаўства.

У **Англіі**. Страты англічан на сухапуцьці на француска-нямецкім тэатры вайны дасьцігли да 18 кастрычніка каля 57,000 людзей.— 3-го лістапада нямецкая эскадра напала на англіцкае узбярэжнае украпленьне Ярмут і разстрэляла некольні невялікіх англіцкіх караблёў, каторые неспадзеваліся нападу немцоў.—У англіцкі прыморскі горад Дувра нямецкіе лятуны перэляцеўшы праліў По-дэ-Кале, кінулі дзьве бомбы.

У **Бэльгіі** немцы умацовываюць нанова Льеж. Лінія Маас—Сомбр так сама умацована, а Бруксэль можна ужо лічыць крэпасьцю. — Паміж Бэльгіей і Голяндзіей спынены зносіны; немцы не пазваляюць нікому пераходзіць з Голяндзіі на Бэльгійскую зямлю.

У **Італіі** забаронена лётаць над іх зямлёй чужаземным самалётам. Лётаць могуць толькі італьянскіе лятуны.

У **Португаліі**—безпарадкі. Бунтаўшчыкі мецеліся узарваць чыгункі і масты. У гарнізоне Браганцы быў бунт.

У **Румыніі** спадзяюцца амнысціі (дараваньне праступкоў) за праступкі проці асобаў каралеўскай фаміліі, а такжэ па ўсіх палітычных справах.—Правоз ваенней контрабанды цераз Румынію у Турэччыну не спыняецца. — Па чутках, румынскі урад безпаваротна пастанавіў ня выступаць ні проці Аўстрыі ні проці Турэччыны.—Паміж афіцэрамі нямецкаго параходу «Эмдэн» знайходзіўся пляменьнік румынскаго караля.

У **Турэччыне**. Турэцкая армія аблічываецца ў 800,000 людзей. У Армэніі зграмаджэна каля 400,000 людзей. Важнейшые турэцкіе порты (ваенные прыстані) падмінованы. Ваенные сілы Турэччыны маюць быць падзелены на тры арміі: першая—на Каўказе, другая —проці Эгіпту, трэцяя—для барацьбы у Эўропе.—Туркі захапілі усе тарговые расейскіе, англіцкіе і француские параходы, стаяўшые у турэцкай прыстані Смірне.—Турэцкі міністр Энвер-паша абвешчэн дыктатарам.

У **Эгіпце**. Увесь Эгіпет па загаду англіцкаго ураду абвешчэн на ваенным палажэньні. Туркі пераходзюць эгіпецкую граніцу.— Эгіпецкі хэдів (віцэ-кароль) заклікае магамэтанскіх жыхароў Эгіпту паўстаць проці англічан; хэдів с 50-цю нямецкімі і турэцкі-

скаго населеньня, а ў Дзісненскім, Вілейскім і Сьвенцянскім паветах —ад 30 да 50 прац. Загнаўся ён і ў Міншчыну ды Вітэбскую губэрні: у Мінскім павеці паказаў на карці ад 30 да 50 прац. у Дрысcенскім—ад 20 да 30 прац.

Статыстыка 1897 году („ўсерасейская перапісь“) паказвае вось колькі палякоў у беларускіх і літоўскіх губэрнях: у Віленскай губ. 8,3 прац„ у Гродзенскай—12 прац., Ковенскай—9 прац, Мінскай—3 прац. і Вітэбскай—4 прац. Праўда, цыфры гэтые, дадзеные для суцэльных губэрній, не зусім ясна паказваюць фальш карты пана Козловскаго, але і іх хапае, каб перэканацца, як перакручэны, напрыклад, ведамасьці аб Віленшчыне ды Гродзенскай губэрні. Калі-ж возьмем чыста навуковые працы аб беларускай этнографіі, як «Бѣлоруссы» праф. Карскаго, як выданые Кракоўскай акадэміей зборнікі беларускіх народных твороў, запісаных *палякам* М. Фэдоровскім якраз у тых мейсцах, дзе пан Козловскі знайшоў адно толькі «польскае» населеньне, калі самі праедзем праз вышэй названые губэрні і прыслухаемся, якой гутаркай гаворыць народ, дык убачым, што апрача Сокольскаго, Беластоцкаго і Бельскаго павету Гродзенскай губэрні, дзе папраўдзі частка селянства—палякі, тутака скрозь жыве спрадвякоў беларускі народ, што палякоў знойдзем адно толькі па гарадох ды панскіх дварох.

Стыд і сорам тым людзям, што хочуць захапіць чужую зямлю павэдлуг *фальшывых дакумэнтоў*. Стыд і сорам ім, калі яны, прыкрываючыся сваімі бытцым-то „поступовымі“ думкамі, ідуць да расейскаго поступоваго грамадзянства, каб падбіць яго на нягоднае дзела--насільства над жывым народам! Ад іх адвернуцца ўсе лепшые, ўсе сумленные людзі, а народ беларускі кіне ім слова пагарды.

Іначэй нельга глядзець на тых, хто ў момэнт, калі для польскаго народу заясьнела зорка лепшай будучыны, уздумаў налажыць пуPты на народ беларускі. І мы, спагадаючы палякам у іх жаданьні вызваленьня для *іхнай зямлі*, атказжэм тым, хто галіцца на *нашу* зямлю: *не дамося!*

Г. Б.

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**Боты для войска.** У Вільні надовічы спэцыяльная камісія пад загадам паліцмэйстара прыняла першую парцію ботаў, пашытых для войска мейсцовымі шаўцамі. Сцьверджэна, што боты пашыты добра і з добраго матэр'ялу.

**Бялізна для войска.** Віленскае дабрачыннае т-во «Доброхотная Капейка» прыняло на сябе загатоўку для арміі 75,000 комплектоў бялізны (комплект — кашуля, патштанікі і ручнік). За кожны комплект інтэндапцтво будзе плаціць т-ву па 14⅕ кап.

**Продаж с таргоў** (ліцытацыі). Віленскі земскі банк прызначыў на продаж с таргоў 62 нерухомые ўласнасьці у Вільні і 74 двары у віленск. губ. На першые ліцытацыі адбудуцца у г. Вільне у памешчэньні банку 19 і 20 лістапада, а на другіе — 25 і 27 лістап. і 2 сьнежня. Калі ў гэтые дні ліцытацыя не ўдасца, то другі раз адбудуцца: на першые—10 сьнежня, а на другіе—19 сьнежня.

За нявыплату рат у сваім часе Петраградзка-Тульскі банк будзе прадаваць 12 лістапада ў Петраградзе с публічных-таргоў: 34 дамы у Вільні, 9 нерухомых ўласнасьцей у Лідзе, Ашмяне і Дзісьне, а такжэ 60 двароў у віленскай губ.

**„Палітурка“.** Надовічы у Вільні на Сіроцкай вуліцы у аднаго жыхара акцызнікі выкрылі браварок с палітуры. — Віленскі губэрнатар адміністраціўна аштрафаваў дворніка Зыгмуся Швэльніка на 1000 р. або 3 мес. пасядзець за ўстройство браварка с палітуры.

**„Анёдым“.** Некаторые селянкі у лідзкім пав., трэплючы лён талакою, частуюцца разведзеным вадой анёдымам. Што ж, на бязрыб'і і рак рыба.

**Стрэляніна па арыштованым.** Надовічы у Вільні сышчык затрымаў злодзея Ф. Рачко. Гэты апошні пачаў уцекаць, тады сышчык два разы ў яго выстрэліў і раніў у плечы і нагу. Зладзея атправілі у бальніцу. Сышчык атрымаў падзяку ад паліцмэйстара.

**Гусі і качкі.** У Вільні прывозюць на рынкі ў таргове дні каля 2,500 жывых гусей і 500—600 качак. Цэна за гусь ад 90 к. да 1 р. 35 к., качкі 50—60 к.

## З Міншчыны.

**Беларусы палякам.** 29 кастрычніка на валасным сходзе у Зьмітравічах, барысаўскаго пав., сабраўшыеся селяне-беларусы пастанавілі як адзін чэлавек выдаць з запасногa валасногa магазыну 150 пуд. збожа для пацярпеўшых ад вайны селян у Польшчы, прычым, калі-б не ўдалося перэвязьці гэта збожэ, то селяне вышлюць грашыма. Адзін с селяноў у сваей прамове сказаў, што польскіе селяне «такіе-ж, як і мы, памагчы ім трэба, бо і нам яны б напэўна памаглі, калі-б нас сустрэла такое нешчасьце.

**Боты для войска.** Па ўсіх паветах мінск. губ. адбыліся сходы шаўцоў с прычыны загатоўкі ботаў для арміі. Усе гарадзкіе упраўленьні мінск. губ. выбралі асаблівые шавецкіе камісіі для прыйманьня пашытых ботаў.

**Газэтные скрынкі для лазарэтоў** пазволена наладзіць у Мінску, куды жыхары могуць кідаць ахвяраваные імі для раненых газэты. Ня шкодзіла-б, каб і ў другіх гарадох, дзе ёсьць раненые, аб гэтым самым парупіліся.

**Для дзяцей запасных,** паклiканых на вайну, вучні мінскаго вучыцельскаго інстытуту маняцца даваць лекціі дарма.

**Аб навароджэных.** Мінскае губэрскае праўленьне прызнало, што навароджэнае дзіцё, бацька якога пакліканы на ваенную службу, павінна атрымліваць ат казны запамогу за час ад нараджэньня да першаго чысла наступаючаго месяца, а такжэ і далей—кожны месяц.

**На прызыве** у мінскім участку прынята на ваенную службу 266 хрысьціян і 103 жыды.

**Мінская губэрня** стаіць усяго толькі на другім мейсцы па вырабу гарэлкі. Цяперака, як гарэлцэ прыйшоў канец, то паны-спіртаробы ня ведаюць што рабіць з бульбай. Між іншым маняцца, хлапатаць перад урадам, каб была зменшана акцыза на дэнатурованы спірт і каб шоў ён на тые патрэбы, на якіе ідзе цяпер бэнзына, а на бэнзыну каб была акцыза павялічэна.

**Суд.** Дзьвінскі ваенна-акружны суд прысудзіў на сьмерць пазбаўленаго правоў Лепкоўскаго за разбойства ў ковенскай турме; прыгавар суду выпяўнена 23 кастрычніка. — Аддадзены пад суд: 1) быўшы земскі начальнік І. Сніт ко за прысваеньне чужых грошы, 2) начальнік высокадворскай почты (віленск. губ. троцк. пав.) І. Янкоўскі за прысваеньне казённых грошы і службавые ашуканствы і 3) мешчанскіе старасты—туроўскі мазырск. пав. Глозман, пінскі Макееў, і бярэзінскі Рубенчык. Пачата угалоўнае следзтва проці стоўпецкаго старасты Несвіжскаго, озарыцкаго—Лібмана і копаткевіцкаго—Гершановіча.

**Польская гімназія.** Палякі хла-

---

каб селянін умеў жалавацца — ён і да Цара дайшоў-бы, расказаў-бы аб усіх парадках... Але тое ж і ліха, што яго язык ня можэ вылажыць усяго, што чуе сэрцэ... Але зараз Міхась спахапіўся: «ось каб дазнаў земскі, што я гэтак мысьлю!..» і хутчэй пакіраваў свае думкі у другую старану.

Далей ішла рэч аб тым, што селяне павінны паставіць значаные слупкі на вучастках, каб, значэ, с першаго вока было відаць, чыя дарога непапраўлена. Міхась бачыў, што гэта робіцца усё на мужыцкую шыю, але ён нічога не сказаў перад земскім, лічучы тое, што ён—стараста, і мусіць кіравацца туды, куды кірует земскі.

Селяне абрадзілі, што гэтае дзела нагаaняе іх у кошт. Яны не маюць свайго лесу, а з іх, вось, патрэбуюць слупкі!

— Памешчыкі нехай, вашэ брагародзе. Яны лесам багаты...

Але земскі не хацеў і слухаць.

— Сказалі вам,—вы і далжны! Яшчэ прыгразіў, што за іх кошт пастаўлюць слупкі. Пачуўшы гэта, селяне звярнуліся да старасты, ці па закону так, але той нават і віду не паказаў, што думкі аднаковые с селянамі, а неяк срога, мацней як трэба атказаў:

— Гаспадзін земскі кажэ...

Земскі пачуў словы старасты і зьвярнуўся да яго:

— Стараста, ты как думаеш: далжны ані слушаць, што я гавару?

— Так тошна, вашэ благародзе! как вы іхні начальнік, то злога ім ня можэце...

— Да не аб том! А вот скажы, я правільна гавару?...

— Тошно так, вашэ благародзе!—атказаў Міхась.

IV

Чым далей, тым болей Міхась пазнаваў сваю ўласьць. Ен разумеў тое, што людзей у вобчэстве многа, а ён—стараста—адзін. Значэ, ён важней ад усіх; ён змешчае у сваей асобе усе вобчэствы. Дык выходзе, што ён у вобчэстве—усё! Старастоўства, значэ, не павіннасьць якая, а «чын». А с кожнаго чыну трэба карыстацьc, бо чын даецца не ўсякаму.

І Міхась трохі-па-троху пачаў карыстаць с свайго чыну. С кім зайдзе у піўную, ад каго «падзякуй» возьме. Умеў і напомніць недагадлівым людзям, як тые забываліся у патрэбнай рэчы...

Прыйшла восень і усё безгалоўе разам нахлынула на Міхася. Тут і дарогі, тут і падаткі, тут і воінская павіннасьць. Міхась ад раньня да вечэра бегае па сялібах: таму заказвае, таму прыказвае. Грозіць, як ня слухаюць. Земскі выдумляе Міхасю за дарогі і за падаткі, пісар што ні дзень ганяе з абвесткамі... Зусім парваў Міхась свае боты. Ужо з месяц як ён іх ня чысьціў, баіцца шчоткай дакрануцца: пад гразёй не так прыметны дзіры. Кожную раніцу абуваючыся, глядзіць ён на свае боты і мысьліць:

— Трэба новые.

Ажно яму пашэнціла у гэтым. Прыйшоў неяк прыказ загадаць селянам, каб далі коней апалчэнцоў завезьці у Ашмяну. Пайшоў Міхась коней загадаць... і прынёс да дому перады на новые камашы! Дзе ён іх дастаў, як і хто іх яму даў, не хваліўся Міхась. Толькі шавец, каторы шыў яму гэтые камашы, адразу апазнаў, што перады былі с фабрыкі купца Скурнікэ. Затым даведаліся яшчэ, што гэты купец не пасылаў свайго каня пад звоз апалчэнцаў, а як у ўдавы Вінцусіхі, дык Міхась с поля забраў яе каня...

V

Камашы выйшлі—хоць на выстаўку! Ненацешыцца Міхась, ненагледзіцца. І тавар памацае, і швы пашчупае... Нішто не ганьбіць, здаецца. Агледзіўшы аж да «макулінкі», Міхась заматаў камашы уануучку і схаваў у шафу, запхнуўшы іх у самы куток.

У нядзелю Міхась адзеў ужо сваю навіну, а боты загадаў аднясьці у паправу, і пайшоў да цэркві. Але мусі было суджана яму на тое ліха. Па дарозе спаткаў яго старшыня і і загадаў экстрэнна зьбегаць у вёску, за вёрст пяць ад мястэчка. Міхась жаласна паглядзеў на свае камашы, але не пасьмеў адгаварыцца, бо дзела ткі было надта пільнае. Памычэў, Міхась, патопаў, а ткі пайшоў куды пасылаў яго старшыня.

Пагода была ад злой моцы благая. Дождж, лужы па калені і ліпкая балотная гліна... Камашы Міхася пілі ваду і елі балота. Расхляbіліся, распаўзліся адразу, і ногі шлёпаліся у іх, нібы у дзежах, выціскаючы брудную жыжку. Прынёс Міхась да хаты ужо не камашы, а благіе атрэпкі. Паглядзела Міхасіха, і кажэ да Міхася:

— Дзе-ж гэта ты чопкаўся гэтак? Людцы мае!.. І куды цябе насіла нялёгкая па гэтакай гразі?!.

— Куды?.. Ты хочыш знаць, куды? Табе ня дзела, гэтае знаць! — атказаў сярдзіта Міхась, і без таго ужо згрызены.

— Чаму гэта, ня дзела? Ды глянь-жэ ты на свае камашы. Якіе яны ёсь!

— Я колькі раз казаў ужо табе ня совацца не ў свае справы.—Сур'ёзна адазваўся Міхась да жонкі. — Колькі раз ужо я цьвярдзіў табе гэта! Ты знаеш, што я—стараста! У мяне бываюць справы гасударственай важнасьці...

— Ды не аб справы твае, згінь ты, прападзі, я пытаю цябе, а аб камашы!

— Ну?

— Згінулі адразу. Палопаліся усе!

— Ну і нехай! За што купіў, за тое і прадаў. А дармавому каню у зубы не глядзяць.

— Хаця ні дармавому?..Што табе іх даў хто, або ты іх знайшоў?.. Шаўцу яшчэ не заплачэна а камашаў ужо німа!

Міхась прамоўчыў на гэтые жончыны словы. Ен укрыў ад яе, што камашы ён дастаў ад купца. Да гэтаго-ж Міхась бачыў, што баба праўду кажэ: шаўцу трэба будзе ткі заплаціць... Змоўк Міхась, а за ім зараз і баба, і сварка скончылася.

Але як толькі выйшла жонка с хаты, Міхась зноў пачаў разглядаць камашы. І на гэты раз выкрылася, што тавар быў падпалены, ад гэтаго ён адразу і палопаўся.

Міхась ня мог даравацъ сабе, што гэтак звёў яго Скурнік, даўшы яму падгарэлую пару камашаў. Які-ж ён дурэнь быў, як прыймаў ня гледзючы, што яму даюць! Скурнік пэўна насьмяецца цяпер з яго... Вось табе і «дармавы конь»—спажыві яго!

— «Ну, пачэкай-жэ! — Уздыхнуў Міхась, абуваючы свае старые боты.—Пачэкай! Другі раз аддзякую не так! Паставіш ты мне ужо не аднаго, а двух каней! На варту будзеш хадзіць ня ў вочарадзі! Цяпер от зусім ня ходзіш... усё з маей ласкі! А ты мне што даў?.. Гарэлы скурат?!. Пачэкай-жэ!

Міхась выцяр анучай свае старые боты, адзеўся і пайшоў разносіць абвесткі і прыказы.

**Панас Гаварэнь.**

почуць аб аткрыцьці у Мінску польскай гімназіі, аб чым была пададзена найпадданьшая просьба Гасудару Імпэратору у часе прабываньня Гасудара у Мінску.

**Пажар сынагогі.** У сяле Доманово, бабруйск. пав. згарэла сынагога (жыдоўская школа), прычым у агні згінулі скруткі Торы.

**Скарб.** У вёсцэ Вялікіе Бортнікі, бабруйск. пав., хлопчык Васіль Шэвялёў, 11 гадоў, выкапаў скарб 4,472 серэбраные манэты с 1536, 1546, 1559, 1570 г.г. З іх 51 вялічынёў у паўрубля, 3 ў пятачок, 4418 па 15 кап.

---

Каб памагчы безработным знайсьці работу, пры віленскай гарадзкой управе наладжэно *пасрэдніцкае бюро працы.*

Гарадзкая управа просіць гаспадароў і рабочых, католые шукаюць працы, звертацца ў бюро дзеля запісі і аб спраўкі што дзень: у будні— ад 10 да 2 і ад 5 да 7 с пал. гадз., а у сьвята—ад 1 да 3 гадз. павэдлуг адрэсу: рог 1-го Паліцэйскаго завулку і Пассажа, Местовы дом № 10.

Бюро памагае у вышуканьні працы без уселякай платы.

---

# З усіх старон.

**Сэкрэтнае заседаньне.** 30 кастрычніка вечэрам адбылося сэкрэтнае заседаньне Рады міністроў, на якім абгаварываліся асабліва важные гасударственные пытаньня цяперашняго мамэнту. Паміж іншым былі заслуханы паведамленьня ваеннаго міністра, міністра фінансоў і міністра заграпічных справоў.

**Кассо,** міністр асьветы, сур'ёзна захварэў на рак жывата. Газэты пішуць, што п. міністэр ужо падаўся у атстаўку.

**Як адрэсаваць у каўказкую армію.** Пасылаючы пісьмо таму, хто знайходзіцца у гэтай арміі, трэба дабаўляць на адрэсах: «у Каўказкую армію». Пры гэтым, як і ў дзействуючую армію, трэба акуратна пісаць: чын, імя, отчэство (па бацьку) і фамілію адрэсата, а такжэ названьне часьці, або установы, у якой адрэсат служыць Напрыклад: «Въ Кавказскую армію, 5-й пѣхотный Калужскій полкъ. Рядовому 7-й роты Мікалаю Пасьпешцэ».

**Пасылкі і пісьмы** з абвешчэнай цэннасьцяй на імя расейскіх ваеннапалонных у Нямеччыне і Аўстрыі ужо можна перасылаць.

**Спраўкі аб забітых,** раненых і прапаўшых бяз весьці ужо разсылаюцца Глаўным Штабам для начальнікоў губэрній, обласьцей і граданачальнікоў. Гэткім чынам хутка будзе ведама у кожнай воласьці хто і як з ваякоў пацярпеў на вайне.

**Вучыцелёў салдатоў,** як падлічыла газэта «Школа и Жизнь» пасьля мобілізаціі у Петраградзе, знайходзіцца у кожным паўку па 30—40 чэлавек сабраных з розных канцоў Расеі.

**Дармавые білеты** для вельмі бедных сем'яў пакліканых на вайну выдаюцца на праезд па ўсіх расейскіх чыгунках III і IV клясы. Каб аблягчыць гэту справу, удаставерэньні на атрыманьне дармавых білетоў пазволена выдаваць гарадзкім галовам і уездным спраўнікам. — Сваякі раненых, як раз'ясьніў начальнік Палескіх чыгунак, права на дармавы праезд дзеля адведываньня раненых не маюць.

**«Уцекачоў»** за час вайны знайходзілася у Мінску каля 4,000, у Вільні 3.500 з лішнім, і ў Варшаві каля 30000 уцекачоў.

**Шыцьцё бляізна для войска.** Глаўнае інтэнданцтво маніцца паклікаць на гэту работу таварыствы жаночай помачы ў працы, дробные майстэрні кравецтва і бялізны, аддзельных асоб, а такжэ жонак і іншую радню сем'еў, якіх гаспадары пакліканы на вайну.

**Помач для сем'ёў запасных.** За тры месяцы вайны Масква зрасходовала на раненых і на запамогі для сем'ёў запасных 6,700 тыс. руб.

**К прызыву студэнтоў.** Ваеннае ведамство раз'ясьніло, што студэнты, якіе знайходзюцца на службе у «Чырвоным Крыжу», на ваенную службу пакліканы ня будуць.

**Па сібірскім шляху** за апошніе 20 дзён перэпраўлена у Сібір 58,457 аўстрыяцкіх і нямецкіх палонных

**Падатак с пісьменнікоў.** Ваеннападаходным налогам маняцца аблажыць журналістоў (што працуюць у часопісях), але толькі такіх, што атрымліваюць сталую плату за сваю працу.

**Павялічэньне акцызы.** Ёсьць праект павялічыць на 50 прац. цло (падатак з заграпічных тавароў) ад гарбаты, кавы, селядцоў і інш. прадуктоў найболей распаўсюджэных і ўстанавіць акцызу ад фляшкі піва і віна ад 10 да 50 к,

**Усерасейская перапіс,** назначэная на 1915 г., с прычыны ваеннаго часу адкладаецца.

**Зборнік законоў аб землеустройстве** Гэткую кнігу недаўна выпусьціў у сьвет дэпартамэнт гасударственаго зямельнаго дабра.

**Яйкі і вайна.** У Рызе на складах і ў халадзільніках прыватных суполак, с прычыны спыніўшагося перавозу за граніцу, сабралося запасу каля 45,000 скрынак, па 1,440 штук яйкоў у скрынцэ.

**Юр'еў і Дзьвінск.** Гэтые гарады часта называлі па даўнейшаму: першы—Дорпат, другі—Дынабург. Цяперака, хто будзе гэтак называць іх, таго будуць цягнуць пад суд

**За газэты.** Засудзілі рэдактароў газэт — «Рѣчь» і «Современное Слово» на тры месяцы турмы за заметкі аб мітынгу на Пуцілоўскім заводзе. — Рэдактара газэты «Русское Знамя» засудзілі на поўгода у турму за тое, што у сваей газэце лаяў арлоўскаго губэрнатара і віцэгубэрнатара, і так сама засудзілі яго па другому дзелу на поўгода за стацьцю, скіраваную проці прысяжнаго паверэнаго Заруднаго.

**Адміністраціўные штрафы** за 1913 г. узысканы: за газэты і інш. часопісі 92,098 руб., за праступкі проці абавязываючых пастановоў 853,000 р. і за неяўку к адбываньню ваеннай службы 280,000 р.

**Адміністраціўна высланых** у аддаленые мейсцы налічываецца у гэтым часе 1,300, апрача гэтаго 750 асоб знайходзіцца пад паліцэйскім над'зорам.—Па загаду Петраградзкаго граданачальніка ад 24 кастрычніка на аснове ваеннаго палажэньня забаронена пражываць у сталіцы 160 асобам.

**Праз цемпату.** Летась у маі селяне села Осічкі былі склікаты на сход выбіраць выбарных у валасны суд па новым закону аб мейсцовым судзе. Прыйшло на сход 193 селян. Але ўсе яны ад выбароў атказазіся, думаючы, што рэформа суду звязана з новымі налогамі. На пытаньне старшыны сходу, кожны селян атказываў: — Я як всі—не хачу выбіраць. Пасьля выявілося, што падбунтовывалі к гэтаму два селяніны М. Ладчук і Ф. Бондар. Усіх селян пацягнулі пад суд і засудзілі: Ладчука і Бондара у турму на 4 месяцы, а рэшту па 1 месяцу кожнаго.

**Проці жыдоў.** Ноўгародзкі губэрнатар забараніў жыць у горадзе сёстрам міласердзе і доктарам жыдоўскай веры. — Петраградзкі граданачальнік 26 кастрычніка абвесьціў па паліціі, што 40 жыдоў рамесьнікоў, якіе пакінулі сваё да гэтаго часу рэмясло, выселяюцца з гораду.

**Спынена збор ахвяр** на памятнікі Н. Гоголю і Т. Шэвчэнко. Аб гэтым паведамляе кіеўскаго гарадзкога галаву палтаўская губэрская земская управа.

**Гр. Шэптыцкі,** быўшы уніяцкі мэтрапаліт цяпер знайходзіцца у Курску. Доступ да мэтрапаліта забаронена як ёсьць усім. Газэт не атрымлівае. Памешчэньня яго безупынна сьцеражэ паліція. Кніжкі дастаўляе яму з бібліотэкі акалодочны, але кожны раз працэнзурованые губэрнатарам. Цяперака гр. Шэптыцкаму пазволена праходзіцца па горадзе; пры гэтым па глаўных вуліцах і ў таварыстве паліцейскіх. Уселякая як ёсьць карэспандэнція яму забаронена.

**Проці туркоў.** У Кіеве і у граніцах Рэвельскаго ваеннаго раёну загадана арыштаваць і выслаць у Тамбоўскую губ. усіх турэцкападданых, ваенна-абавязанных узростам ад 17 да 50 год, апрача хрысьціян.

**Проці немцоў.** У Адэсі генерал-губэрпатар выдаў абавязываючую пастанову, па якой, пад штрафам да 3000 р. або адседкі у турме ці крэпасьці да 3 месяцоў, забараняюцца: 1) зборышчы ўзрослых мужчын-немцоў болей двух, нават расейска-падданых, як у сваіх хатах, так і паза хатамі; 2) гаварыць па нямецку паза сваім домам; 3) вывескі у нямецкай мове, а такжэ дзьверные табліцы на ўходных дзьверах сваіх кватэроў, візытовые білеты (картачкі) і пісьмы; 4) друкаваньне друкарнямі газэт, брашур, кніг. абвестак, плакатоў і візытовых білетоў у нямецкай мове, а такжэ вырэзку і выліўку у тэйжэ мове мэталёвых табліц майстэрнямі, якіе займаюцца гэтым рэмяслом.

**У Фінляндзіі** на ўвесь час ваеннаго палажэньня спынена выдавецтва фінскай газэты «R uman Lechti».—Па загаду глаўнаго упраўленьня справоў друку забаронена ўвоз у Фінляндзію часопісеў у нямецкай і вэнгерскай мове.

**У Польшчы.** Падчас прабываньня у Варшаве важнейшых акцябрыстоў адбылася нарада паміж імі і польскімі грамадзянскімі прэдстаўнікамі у справе хаўрусу Польскаго Кола з акцябрыстамі!).—Папечыцель Варшаўскаго навуковаго округу паведаміў цыркулярам, што навучаньне у польскіх школах расейскай і цэркоўна славянскай мовы, а такжэ гісторыі і географіі павінны адбывацца па расейску і забараняецца гэтые навукі вясьці вучыцелям палякам. Польскіе газэты, пішучы аб гэтым цыркуляры, кажуць, што тут выйшла нешта ня тое, бо новае права пазваляе вучыць гісторыі і географіі па польску і не агранічае нацыональнасьці вучыцелёў на гета. — Па загаду варшаўскаго губэрнатара, каб воласьці паведамілі аб стратах прычыненых вайной, войт воласьці Прушков даносіць, што страты гэтай воласьці раўняюцца 2,150,000 р.

**У Галіччыне** пакуль-што зачынены усе украінскіе і польскіе школы з браку вучыцелеў-расейцоў. Цяперака расейскі урад праектуе для падгатоўкі вучыцелеў аткрыць спэціяльные курсы, на якіх будуць вучыць толькі расейскай мовы.—Львоўскі генерал-губэрнатар абвесьціў, што будуць аддавацца пад ваенны суд усе тые жыхары непрыяцельскіх обласьцей, занятых расейскай арміей, якіе будуць па ваеннаму часу вінавачэны: у паўстаньні, шпегоўстве, сумысным псаваньні і зьністажэньні рэчаў прызначэных для войска, прыладаў для нападу, абароны і транспорту, сумысным убіўстве, падпалу, разбойстве, грабежстве і ўвыружаным супраціўлёньні ўласьцём. — У Петраград прывязлі 40 дзяцей з Львова арыштованых аўстрыякамі і бяз весьці прапаўшых галічан. Дзеці узростам ад 13 да 17 год. На вагзале сустрэў іх обэр-пракурор Св. Сыноду і гр. Бобрынскі. У Львове зьбіраецца новая парція такіх сірот, якіе будуць высланы да краю пад апеку добрых расейскіх людзей.—Хваробы у Львове агулам не даюцца у знакі. На правінціі маняцца залажыць 20 халерных бальніц, першую з іх ужо аткрылі у Раздолі.—30 верэсьня аткрылася у Львові шмат расейскіх таварыств: навуковае т-во імені Качкоўскаго, „Русская Рада", т-во расейскіх кабет „Жизнь". Закрытые украінскіе таварыствы не аткрываюцца.

---

Рэдактар-Выдавец
**І. Луцэвіч.**

---


## Ад рэдакціі „Сахі" і „Лучынкі"

Рэдакція сельска-гаспад. месячніка «САХА» і літэратурн. месячніка „ЛУЧЫНКА" перайшлі у Мінску на Захарэўскую вул. № 24 (проці новаго касьцёла).

С прычыны вайны месячнікі прыастанавіліся, а цяперака скора будзе выходзіць „САХА", а потым „ЛУЧЫНКА".

**Рэдактар-Выдавец.**
А. Уласоў.

Выйшоў з друку і прадаецца

## „БЕЛАРУСКІ КАЛЕНДАР"

## на 1915 год.

Календар надрукованы двумя асобнымі выданьнямі: рускімі і лацінскімі літэрамі, з іншым у кожным тэкстам. Заказы на календар трэба прысылаць у „Беларускую Кнігарню", Вільня, Завальная № 7.

**Цэна календара 10 к., с перасылкай—15 к. Гандлярам уступка**


---

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.